

Хто забыў сваіх
продкаў – сябе
губляе,
Хто забыў сваю
мову – усё згубіў.

У. Караткевіч

***Уладзімір Караткевіч***
***(1930 –1984)***

**Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч – паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, кінасцэнарыст.**





Першы пісьменнік, які звярнуўся да жанру гістарычнага дэтэктыву.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Івана Мележа (1983 г. – за раман «Нельга забыць») і Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1984 г. – за раман «Чорны замак Альшанскі»).

Нарадзіўся **26 лістапада 1930 года ў** г. Орша Віцебскай вобласці.



***Бацькі У. Караткевіча Надзея Васільеўна і Сямён Цімафеевіч (у чыне калежскага сакратара), 1915 г.***

Бацька – **Сямён Цімафеевіч** (1887–1959) – паходзіў са старажытнага шляхецкага роду, закончыў гарадское вучылішча ў Оршы, працаваў у казначэйстве, служыў у царскай арміі пісарам, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі быў супрацоўнікам фінансавых органаў.

Маці – **Надзея Васільеўна** (1893–1977)– таксама паходзіла са старажытнага шляхецкага роду, з роду Грынкевічаў. Пасля заканчэння Марыінскай гімназіі ў Магілёве некаторы час працавала настаўніцай, потым была хатняй гаспадыняй.



***Родныя Уладзіміра Караткевіча: цётка Яўгенія Васільеўна, бацька Сямён Цімафеевіч, дзед Васіль Юльянавіч Грынкевіч, маці Надзея Васільеўна, сястра Наталля і брат Валерый, 1928 г.***

У сям'і было трое дзяцей:
сын Валерый (1918 – загінуў у 1941 г. на вайне), дачка Наталля (1922–2003), сын Уладзімір.

Вялікі ўплыў на Уладзіміра аказаў дзед па лініі маці **Васіль Юльянавіч Грынкевіч** (1861 – 1945).
Ён стаў прататыпам Данілы Вежы-Загорскага ў рамане «Каласы пад сярпом тваім».



***Уладзімір Караткевіч у дзяцінстве з маці і сястрой Наталляй, г. Орша, 1937 г.***

Уладзімір навучыўся чытаць у тры з паловай гады. У дзіцячыя гады разнастайнасць яго талентаў выявілася і ў схільнасці да малявання, якая захавалася на ўсё жыццё. Таксама ён меў абсалютны слых, некаторы час займаўся ў музычнай школе.

У шэсць гадоў ён напісаў першыя вершы.
Трохі пазней паспрабаваў пісаць апавяданні, якія сам жа і ілюстраваў. Яшчэ ў даваенныя гады адправіў ліст Карнею Чукоўскаму, на які атрымаў адказ.
**У 1938 г.** Валодзя пайшоў у школу ў Оршы.

Пасля заканчэння трэцяга класа ў пачатку лета 1941 г. прыехаў у Маскву да старэйшай сястры Наталлі, якая вучылася там у хіміка-тэхналагічным інстытуце.

Вялікая Айчынная вайна застала яго ў Маскве.

Валодзя разам з маскоўскімі дзецьмі трапіў у эвакуацыю ў Разанскую вобласць, потым на Урал у Молатаўскую (Пермскую) вобласць. Толькі ў жніўні 1943 г. сястра змагла прывезці Валодзю да бацькоў у г. Чкалаў (Арэнбург).

У кастрычніку 1941 г. на фронце загінуў старэйшы брат Валодзі Валерый. Жонку Валерыя Вольгу, якая заставалася на захопленай нямецкімі войскамі тэрыторыі, забілі акупанты.





**Восенню 1944 г.**
сям'я вярнулася ў Оршу.
З канца 1946 г. яны пачалі жыць ва ўласным доме, куды ў пазнейшы час Уладзімір Караткевіч будзе прыязджаць і працаваць над сваімі творамі.




Яшчэ адным такім творчым кутком для Уладзіміра Караткевіча стане дом сваякоў у **Рагачове**, пабудаваны дзедам Васілём у 1914 г.

У Рагачове былі задуманы і напісаны многія знакамітыя творы Уладзіміра Сямёнавіча.

Нават існуе параўнанне значнасці для Караткевіча знаходжання ў гэтых мясцінах з болдзінскім перыядам у Пушкіна.

У пачатку творчага шляху Караткевіч звярнуўся да беларускай гісторыі і фальклору: творы «Казкі і легенды маёй Радзімы», «Лебядзіны скіт», казка «Вужыная каралева».



УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

1Н/208342К
(039)

# Лебядзіны скіт





## ЛЕБЯДЗІНЫ СКІТ

Даўным-даўно дзень аднойчы ўзышоў не ў сонечным святле, а ў зараве пажараў, і чорная копаць паняслася на захад. Гэта living рознапляменныя орды ўладара Батыя пайшлі навалай на рускую зямлю. Ішлі, грымя зброяй, кумыцкія сотні, ехалі ў чорных даспехах цёмнікі перад радамі татарскіх палкоў, ехалі на вярблюдах белатварыя жыхары Харэзма, а ззаду іх валакліся вялізныя хурманкі з нарабаваным дабром і белавалосымі паланянкамі. Усё шло як трэба: вучні жрацоў авалодвалі чарамі ў час малпы, іржалі коні, брахалі сабакі ля прапахшых дымам кібітак, гушкалі жанчыны мурзатых дзяцей, якія сачылі касымі вачыма за адбіткам пажару на крывых мячах сваіх бацькоў. Наперадзе яны сустракалі зялёныя палі, хаты ў садах і стракатыя гарады, а ззаду пакідалі толькі чорную пустэчу, па якой як жадаў хадзіў вецер, узнімаючы сталбы попелу. І болей нічога не заставалася на калісьці зялёнай зямлі.

Хмарамі нясліся стрэлы, пыл гарадоў дасягаў неба, жадныя рукі хапалі каляровыя рантухі[1], табін[2], саф'янныя кабці[3], вопратку з

[1] Шаль.
[2] Гатунак едвабу.
[3] Абутак.

Асобным выданнем раман «Нельга забыць» («Леаніды не вернуцца да Зямлі») выйшаў толькі ў **1982 г.**

У **1983 г.** за раман Уладзіміру Караткевічу прысуджана Літаратурная прэмія імя Івана Мележа.






*Памяці друга майго*
*Геранiма Стулпана — прысвячаю*

УСЕ ІМЁНЫ І ПАДЗЕІ Ў ГЭТЫМ РАМАНЕ — ВЫДУМАНЫЯ. УСЯКАЕ ПАДАБЕНСТВА З РЭАЛЬНА ІСНУЮЧЫМІ ЛЮДЗЬМІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЫПАДКОВЫМ.




«Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (пісаўся ў 1965–1966 гг., апублікаваны ў 1972 г.) – раман, прысвечаны сярэднявечнай Беларусі, супрацьстаянню разняволенага чалавечага духу, гуманізму і цемрашальства, асэнсаванню гістарычнага лёсу зямлі і яе народа.

Шмат зрабіў Уладзімір Караткевіч і для беларускага кінематографа, напісаў сцэнарыі дакументальных фільмаў: «Сведкі вечнасці» (1964 г.), «Памяць» (1966), «Будзь шчаслівай, рака» (1967).
У 1967 г. паводле сцэнарыя Караткевіча быў зняты кінафільм «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».



У **1969 г.** выйшаў паэтычны зборнік «Мая Іліяда».



Ба 106388

УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

МАЯ ІЛІЯДА * ВЕРШЫ

Б 106388
Бел. аддзел 1994 г.

У **1977 г.** выдадзены нарыс пра зямлю Беларусі, яе гісторыю, прыроду і культуру **«Зямля пад белымі крыламі».**
.



Ілюстрацыя да кнігі «Зямля пад белымі крыламі».

ЗЯМЛЯ МАЯ БЕЛАРУСКАЯ

## АД ПАЛЕСКІХ ІМХОЎ ДА АСВЕЙСКІХ КРЫНІЦ

Насельніцтва Беларусі складае больш за 9 мільёнаў 300 тысяч чалавек. З іх беларусаў 7 мільёнаў 286 610 чалавек. У вайну, вы ведаеце, загінуў кожны чацвёрты жыхар рэспублікі. Часам едзеш лесам, і раптам — паляна, здзічэлыя садовыя дрэвы (вёска так і не адрадзілася) і абеліск, а на ім словы, ад якіх сціскаюцца кулакі і ідзе па скуры мароз:

**«Тут пахаваны**
**расстраляныя немцамі**
**12.IX.1943 г.**
**Кароль Алена Мікітаўна**
**1925 года нараджэння,**
**Павел 1920 г.,**
**Васіль 1898 г.,**
**Зофія 1892 г.,**
**Уладзімір 1922 г.,**
**Іван 1924.,**
**Мікола 1927 г.,**
**Марыя 1934 г.,**
**Вера 1939 г.,**
**бабуля 70 год,**
**Сіневіч Антон Валяр'янавіч 1884 г.**
**і Серафіма Іллінічна 1888 г.**
**і іншыя».**

Гэта значыць, за сувязь з партызанамі ці проста так, з помсты, прыехалі немцы, ачапілі сяло, загналі мірных жыхароў у гумно і спалілі. Такім ці іншым чынам было ператворана ў попел





*У святочны дзень*

Ілюстрацыя да кнігі «Зямля пад белымі крыламі».



Камянецкая вежа. XII ст.



*З фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

Уладзімір  Караткевіча пісаў творы і для юных чытачоў.
У **1975 г.** выйшаў у друк яго зборнік «Казкі».






У **1979 г.** у часопісе «Маладосць» быў надрукаваны вострасюжэтны дэтэктыўна-прыгодніцкі раман **«Чорны замак Альшанскі»,** які Уладзімір Караткевіч прысвяціў сваёй жонцы Валянціне Браніславаўне. Твор пачынаецца словамі: «В.К., якой гэты раман абяцаў дзесяць год назад, з удзячнасцю».







ЧОРНЫ ЗАМАК АЛЬШАНСКІ

РАМАН

*В. К., якой гэты раман абяцаў*
*дзесяць год назад,*
*з удзячнасцю.*

**Частка 1. ГРОЗНЫЯ ЦЕНІ НАЧНЫЯ**

З чаго мне, чорт пабірай, пачаць? З таго прадвесня, калі за акном было сутонне і мокры снег?

А што вам да леташняга снегу й сутоння? Пачаць з таго, хто я такі?

А што вам, урэшце, да мяне, звычайнага чалавека ў вялізным горадзе? І нашто вам мая самахарактарыстыка?

Адразу браць быка за рогі і расказваць? А якое я маю права на вашу ўвагу? Тое пра-

Мал. П. Драчова

У **1980 г.** у сувязі з 50-годдзем Уладзімір Караткевіч быў узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.



У Мінску, Оршы, Віцебску і Кіеве пастаўлены помнікі Уладзіміру Караткевічу. На дамах у Оршы, дзе Караткевіч жыў у канцы 1950-х гг., і ў Мінску, дзе была яго кватэра, усталяваны мемарыяльныя дошкі. У гонар пісьменніка названы вуліцы ў Оршы, Віцебску, Рагачове. Імя Уладзіміра Караткевіча носяць сярэдняя школа ў Оршы, Фонд дапамогі маладым пісьменнікам, прэмія выдавецтва «Мастацкая літаратура».



**Помнік у г. Кіеве**



**Помнік у г. Мінску**



**Помнік у г. Оршы**

У 2000 г. у г. Оршы адкрыты музей пісьменніка.



**Заданне 1 “Задай пытанне “** (падчас слухання біяграфіі У. Караткевіча запішыце 4 пытанні, а затым задайце другой камандзе). Максімальная колькасць балаў – 4.

**Магчымыя пытанні:**

Чый і які юбілей адзначаем 26 лістапада? (У. Караткевіча 95-годдзе.)

Колькі гадоў адмераў лёс гэтаму пісьменніку?(54.)

Колькі дзяцей было ў сям’і паэта? (Трое.)

У 1980 г. у сувязі з 50-годдзем якую ўзнагароду атрымаў Уладзімір Караткевіч? (быў узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў)

**Заданне 2 ”Так ці не”** (максімальная колькасць 7 балаў). Адзначце правільныя і няправільныя сцвярджэнні.

| | |
|---|---|
| Хан Бату быў перакананы, што палонныя людзі хутка забудуць мову сваю і сваю зямлю | + |
| Паэт Юсуфі меркаваў, што ў скіт увойдзе 20 чалавек | + |
| Чаму старац выбірае смерць? Бо ён і так ўжо стары | - |
| Старац ператварыўся ў вужа | - |
| Ад лебядзінага апярэння стала белай вопратка ў яе людзей | + |
| Паэт Юсуфі збіраўся пакінуць пасля сябе песню | + |
| Народ , на думку хана Бату, гэта статак, у якім кожная жывёла думае толькі аб тым, каб есці другіх і не быць з’едзенай. | + |

**Заданне 3 “Жыццёвыя дарогі”** (устаўце прапушчаную інфармацыю ў тэкст, карыстаючыся матэрыялам для даведак). Максімальная колькасць балаў – 12.

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч – паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, кінасцэнарыст. Нарадзіўся 26 лістапада 1930 года ў г. Орша Віцебскай вобласці. Першы пісьменнік, які звярнуўся да жанру гістарычнага дэтэктыву. Бацька паходзіў са старадаўняга шляхецкага роду, працаваў у казначэйстве. Маці паходзіла са старадаўняга шляхецкага роду, з роду Грынкевічаў. Уладзімір навучыўся чытаць у тры з паловай гады. У шэсць гадоў ім былі напісаны першыя вершы. У 1938 г. Валодзя пайшоў у школу ў Оршы. У Рагачове былі напісаны многія яго творы. На 54-м годзе жыцця Уладзімір Караткевіч памёр. У 2000 г. у г. Оршы адкрыты музей пісьменніка.

## Заданне 4. “Верш-візітоўка”

Расстаўце радкі верша “Бацькаўшчына” ў правільным парадку. Максімальная колькасць балаў – 12 (за кожны няправільны радок балы адымаюцца).

1Дагарэў за брамай небакрай,
2Месяц паміж воблачкаў плыве.
3Выйду зноў, як у мінулы май,
4Басанож прайдуся па траве.
5Дымная, сцюдзёная раса,
6Цёмныя ў траве ад ног сляды.
7А такога рослага аўса
8Я не бачыў доўгія гады.
9Бач, хмызы спляліся, як павець,
10Светлякі мігцяць, гарацць святлей.
11Перад тым як звонка ў лозах пець,
12Прачышчае горла салавей.

**Заданне 5 “Яны глядзяць на нас з партрэта”.** Размяркуйце фотаздымкі згодна прапанаванай табліцы. Максімальная колькасць балаў – 7.

| У.Караткевіч | Р.Барадулін | М.Багдановіч | К.Каліноўскі |
|---|---|---|---|
|  |  |  |  |

**Заданне 6 “Творчая спадчына”.** Адзначце сярод прапанаваных творы, якія не належаць пяру У. Караткевіча. Максімальная колькасць балаў – 4.

Казка “Разумная дачка”, казка “Нямоглы бацька”, Верш “На Беларусі Бог жыве”, казка “Лебядзіны скіт”, нарыс “Зямля пад белымі крыламі”, верш “Калі ласка”, раман “Чорны замак Альшанскі”, раман “Людзі на балоце”, газета “Мужыцкая праўда”, верш “Дзе мой край”.